УДК 821.161.3-14

Навуч. П.В. Крук
Навук. кіраўнік Н.М. Мяркулава
(філіял БДТУ «Бабруйскі дзяржаўны лесатэхнічны каледж»)

# «ЖЫЦЦЁ» ЎНУТРЫ ВЕРША

Кожны паэт, пісьменнік праз свой твор імкнецца выразіць тыя думкі і пачуцці, якія хвалююць яго больш за ўсё. Але любая думка павінна быць змешчана ў нейкую форму і мець змест, інакш яна не будзе мець той мастацкай прывабнасці, якая адрознівае мастацкі твор ад набору слоў.

Наколькі вядома, Караткевіч добра маляваў. Не выпадкова па контурах яго верша можна ўбачыць вобраз ужо немаладога чалавека, якім з'уляўся паэт пад час напісання верша. Магчыма, аўтар хацеў занатаваць самаго сябе і свой стан у гэты перыяд часу, а магчыма, гэты партрэт і ёсць знешняя форма верша.

Я паспрабавала даказаць, што верш – гэта не акамянелая форма, а нейкі «жывыарганізм».

З'яўляецца актуальным даследаванне вершаў як «жывых арганізмаў», якія могуць самастойна жыць пасля іх напісання.

Аб'ект даследавання – вершы У.С.Караткевіча «Стаю ўначы ў завіруху» і «О каханне маё бясконцае».

Прадмет даследавання- гукавы склад вершаў У.С.Караткевіча «Стаю ўначы ў завіруху» і «О каханне маё бясконцае».

Навізна работызаключаецца ў разглядзе вершаў праз частотныя гукавыя ваганні.

Пры разглядзе дадзенай тэмы выкарыстаны наступныя метады работы: параўнальна-супастаўляльны, аналіз і сінтэз.У ходзе майго даследавання на прыкладзе супастаўляльнага аналізу вершаў У.С.Караткевіча «Стаю ўначы ў завіруху» і «О каханне маё бясконцае» былі зроблены спробы пераасэнсавання верша як «жывой формы». У прыродзе, як і ў вершы, абсалютна ўсё ўзаемазвязана ў адзіны арганізм, у якім цесна пераплятаюцца між сабой форма і змест.

Па графіку частотных гукавых і мысленчых ваганняў высвятлілася, што рытм і гук цесна ўзаемазвязаны паміж сабой, вызначаюць мысленчы працэс, які адбываецца ў вершах, які спрабуе выйсці з пачатковай аўтарскай формы.

Па «фізічных» гуках вызначыла, што форма існуе не толькі знешне, але і унутрана. Яна дапамагае ўтрымліваць змест.

Можна меркаваць, што пачатковы «фізічны» гук супадае з перажываннямі і пачуццямі У.С.Караткевіча ў момант напісання гэтых вершаў. Гэта цалкам тлумачыць партрэтны контур, падобны да ўзроставых асаблівасцей паэта. Так аўтар першасна ўстанаўлівае знешнюю форму (цела), у якую затым укладвае нейкае напаўненне – змест. Колер – гэта гукавыя адбіткі пачуццяў, эмоцый, а значыць, з’яўляецца тым напаўненнем формы, без якога немагчыма разуменне верша.

УДК 316.774

Навуч. А.А. Емяльянава
Навук. кіраўнік Н.М. Мяркулава
(філіял БДТУ «Бабруйскідзяржаўнылесатэхнічны каледж»)

## СРОДКІ ПРЫЦЯГНЕННЯ ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ Ў ЗАГАЛОЎКАХ ГАЗЕТНЫХ ПУБЛІКАЦЫЙ

Газета – адно з важнейшых сучасных сродкаў масавай інфармацыі. Яна захоўвае сваё асобае месца ў сістэме іншых СМІ як старэйшае і незаменімае перыядычнае выданне. Сёння перыядычныя выданні вымушаны шукаць спосабы прыцягнення ўвагі чытачоў[2]. Адным з такіх спосабаў з’яўляецца загаловак.

Загаловак засяроджвае ўвагу на найбольш важных і цікавых момантах, заахвочваючы чытача азнаёміцца з тэкстам. Загалоўкі дапамагаюць яму хутка азнаёміцца са зместам нумара, зразумець, пра што паведамляюць яго публікацыі, што важна ў інфармацыі, якую яму прапануюць, што выклікае ў яго асаблівую цікавасць [3].

Актуальнасць даследавання абумоўлена тым, што ў наш імклівы час у людзей усё менш і менш часу чытаць газеты што называецца “ад скарынкі да скарынкі”, і роля загалоўкаў шматразова ўзрастае – менавіта ад іх залежыць, будзе прачытаны матэрыял ці не.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца выяўленне розных сродкаў прыцягнення ўвагі чытачоў у газетных загалоўках; выявіць, артыкулы з якімі загалоўкамі больш прыцягваюць увагу чытачоў. Для дасягнення дадзенай мэты былі выкарыстаны наступныя метады:

1.Метад суцэльнага выбару (сабраць газетныя загалоўкі);

2.Метад класіфікацыі (класіфікаваць газетныя загалоўкі па выкарыстаных у іх сродках прыцягнення ўвагі);

3. Імпірычны метад даследавання (праанкецiраваць навучэнцаў з мэтай выяўлення цікавасці да артыкула).